# ПЕДАГАГІЧНАЯ ВЯСНА Ў МАЗЫРСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ ПЕДАГАГІЧНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ імя І. П. ШАМЯКІНА




16–17 красавіка 2013 года гасцінная і шчодрая на таленты Палеская зямля прымала Міжнародны фестываль “Педагагічная вясна-2013”, які праводзіўся ва ўстанове адукацыі “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна” ў межах Праграмы развіцця вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Падтрымку ў арганізацыі і правядзенні фестывалю аказалі: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Мазырскі раённы выканаўчы камітэт, прафсаюзны камітэт выкладчыкаў і студэнтаў УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна”, Мазырскі раённы камітэт Грамадскага аб’яднання “БРСМ”.

“Педагагічная вясна” – гэта свята творчасці, натхнення і педагагічнага пошуку. Галоўная мэта фестывалю: папулярызацыя сучасных педагагічных ідэй і перадавога вопыту, фарміраванне імкнення да педагагічнай творчасці і самарэалізацыі.

У Міжнародным фестывалі прымалі ўдзел педагагічныя і класічныя вышэйшыя навучальныя ўстановы, каледжы, школы і пазашкольныя ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь і краін бліжняга замежжа. На адрас аргкамітэта паступіла больш за 500 конкурсных работ, якія прадстаўлялі *Расію* (Алтайскі дзяржаўны ўніверсітэт, Сургуцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Кузбаская дзяржаўная педагагічная акадэмія, Паўднёвы федэральны ўніверсітэт); *Украіну* (ВДПУ імя М. Кацюбінскага); *Латвію* (Даўгаўпілскі ўніверсітэт). Геаграфія ўдзельнікаў з *Беларусі* ахоплівае ўсе вобласці нашай краіны (Мазыр, Гомель, Калінкавічы, Рэчыца, Ельск, Светлагорск, Чачэрск, Петрыкаў; Магілёў, Асіповічы; Брэст, Пінск, Баранавічы; Віцебск, Наваполацк, Полацк, Орша; Мінск, Крычаў, Салігорск; Гродна, Ваўкавыск, Ліда і інш.



16 красавіка адбылося ўрачыстае адкрыццё фестывалю. З прывітальным словам да ўсіх прысутных звярнуўся рэктар УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна” доктар біялагічных навук, прафесар В. В. Валетаў. Валянцін Васільевіч адзначыў, што Міжнародны фестываль “Педагагічная вясна-2013” дае магчымасць кожнаму ўдзельніку праявіць свае творчыя здольнасці, пазнаёміцца з вопытам калег-педагогаў, наладзіць творчыя сувязі і міжнароднае супрацоўніцтва паміж ВНУ, каледжамі і школамі Рэспублікі Беларусь і краін бліжняга замежжа. Адзначана была і закана-мернасць правядзення педагагічнага мерапрыемства міжнароднага ўзроўню ў Мазыры, паколькі Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт з’яўляецца вядомым адукацыйным, культурным і спартыўным цэнтрам Палескага рэгіёна, які рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў для адной з самых значных сфер развіцця грамадства – адукацыі.

Поспехаў, плённай працы і новых педагагічных адкрыццяў усім удзельнікам фестывалю пажадала начальнік аддзела адукацыі Мазырскага раённага выканаўчага камітэта Л. С. Клепчукова.

У межах цырымоніі адкрыцця “Педагагічнай вясны-2013” былі падведзены вынікі і ўзнагароджаны пераможцы завочных конкурсаў фестывалю: вучэбна-метадычных распра-цовак *“Творчы пошук”,* творчых работ навучэнцаў і студэнтаў *“Палёт ідэй і натхнення”,* інтэрактыўных вучэбных прэзентацый *“Педагагічны крэатыў”,* відэаролікаў і Flash-прэзентацый *“Выхаванне?..*

МГПУ им. И.П. Шамякина

*Выхаванне!!!”,* эсэ *“Школа вачыма былога вучня”, “Мая Alta Mater”,* фотаработ *“Педагагічны фармат”.*

У дні фестывалю ва ўніверсітэце праводзілася XX Юбілейная Рэспубліканская студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя “Ад ідэі – да інавацыі”, удзел у якой прынялі больш за 900 студэнтаў з Беларусі і краін бліжняга замежжа. Даклады, прадстаўленыя ўдзельнікамі, адрозніваліся граматнай пастаноўкай даследчыцкай праблемы, самастойнасцю творчай і пошукавай дзейнасці студэнтаў. Па многіх пытаннях, заяўленых у дакладах, адбыліся навуковыя дыскусіі. Лепшыя секцыйныя даклады былі адзначаны дыпломамі.

Папулярнасцю ў гасцей і ўдзельнікаў фестывалю карысталіся арганізаваныя выставы; уважліва і зацікаўлена прысутныя назіралі за работай творчых майстэрняў, дзе таленавітыя выкладчыкі і студэнты факультэта тэхналогіі УА МДПУ імя І. П. Шамякіна дэманстравалі працэс стварэння сапраўдных шэдэўраў тэхнічнай творчасці ў стылях квілінг і бацік; удзельнікі фестывалю змаглі наведаць разнастайныя майстар-класы, якія з’яўляюцца яркім пацвярджэннем шматграннасці ідэй, метадаў і падыходаў творчых педагогаў.

Цэнтральнай падзеяй Міжнароднага фестывалю, безумоўна, з’явілася Педагагічная алімпіяда “Прызванне”, у якой удзельнічалі 11 каманд, што прадстаўлялі ўстановы адукацыі: *Паўднёвы федэральны ўніверсітэт* (г. Растоў-на-Дану, Расія), *Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка*, *Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна*, *Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава*, *Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*, *Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова*, *Рагачоўскі дзяржаўны педагагічны каледж*, *Мінскі дзяржаўны радыётэхнічны каледж*, *Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна*, *Рэчыцкі раённы ліцэй*.

Педагагічныя спаборніцтвы праводзіліся ў два дні і складаліся з 4 тураў алімпіяды:

*1 тур:* конкурс “Візітка каманды”;

*2 тур:* рашэнне творчых задач;

*3 тур:* тэарэтычны конкурс (індыві-дуальныя тэставыя заданні па педагогіцы);

*4 тур:* прэзентацыя хатняга задання “Праект школы будучыні”.

Выступленні каманд ацэньвала кампетэнтнае журы на чале з кандыдатам педагагічных навук, дацэнтам, загадчыкам кафедры педагогікі пачатковай адукацыі Галенка С. М.



Падвядзенне вынікаў алімпіяды і ўзнагароджанне пераможцаў адбылося 17 красавіка на цырымоніі закрыцця Міжнароднага фестывалю “Педагагічная вясна-2013”, якую адкрыла Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прарэктар па навуковай рабоце УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна” І. М. Кралевіч. Ірына Мікалаеўна адзначыла, што наш педагагічны форум накіраваны, перш за ўсё, на павышэнне прэстыжу прафесіі настаўніка і захаванне педагагічнай спадчыны ўвогуле. Праграма фестывалю была вельмі насычанай, і вынікі двух плённых дзён работы паказалі, што сучаснае маладое пакаленне адказна ставіцца да працэсу выхавання.

Найбольш значныя і яркія моманты фестывальнага жыцця ўсе прысутныя ўзгадалі дзякуючы падрыхтаванаму арганізатарамі відэадзённіку. У зале панавала цёплая сяброўская атмасфера, і шчаслівыя ўсмешкі, неабыякавыя вочы ўдзельнікаў і гасцей сведчылі аб поспеху педагагічнага форуму.

Кожны ўдзельнік Міжнароднага фестывалю “Педагагічная вясна-2013” і XX Юбілейнай Рэспубліканскай студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі “Ад ідэі – да інавацыі” атрымаў Сертыфікат фестывалю. Каштоўныя прызы капітанам каманд-удзельніц Педагагічнай алімпіяды ўручыў старшыня арганізацыйнага камітэта фестывалю – першы прарэктар УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт В. С. Болбас.

Агульнакамандныя вынікі Педагагічнай алімпіяды “Прызванне” наступныя:

МГПУ им. И.П.Шамякина

Дыпломы пераможцаў **I ступені** атрымалі каманды *Паўднёвага федэральнага ўніверсітэта* (Растоў-на-Дану) і *Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П. Шамякіна.*

Дыпломы **II ступені** атрымалі каманды *Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка* і *Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны*.

Дыпломы **III ступені** атрымалі каманды *Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава* і *Рагачоўскага педагагічнага каледжа.*

Дыпломы і каштоўныя падарункі пераможцам уручыў рэктар УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна” доктар біялагічных навук, прафесар В. В. Валетаў.





“Педагагічная вясна” – гэта свята творчых студэнтаў і педагогаў, вучняў і настаўнікаў. Мы ўпэўнены, што адкрытыя ў Мазыры таленты будуць з кожным днём удасканальваць сваё творчае майстэрства і змогуць дасягнуць новых педагагічных вяршыняў. І для гэтага ў нашай дзяржаве створаны ўсе ўмовы, у тым ліку дзейнічае праграма бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на 2011–2015 гады.

Спадзяемся, што правядзенне “Педагагічнай вясны” ў Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя І. П. Шамякіна стане традыцыйным, а геаграфія ўдзельнікаў значна пашырыцца. Жадаем фестывалю далейшага станаўлення, яшчэ большай колькасці ўдзельнікаў і гасцей!

*Юдзянкова Ганна Віктараўна,*
*спецыяліст аддзела па выхаваўчай рабоце з моладдзю*



МГПУ им. И.П.Шамякина